З каталіцкага друку (155)

Аўтар: Рэдакцыя
07.01.2018 00:00

Сотні тысяч
ружанцаў на ўспамін
аб прыездзе Папы

Вырабам ружанцаў, якія стануць памяткай візіту Святога Айца ў Перу, на працягу 3-ох месяцаў займаюцца вязні з 11-ці турмаў у Ліме. Старшыня Нацыянальнага пэнітэнцыярнага інстытута Карлас Васкес адзначыў, што 1200 вязняў працуюць у рэкордным тэмпе, каб зрабіць 200 тысяч ружанцаў да прыезду папы Францішка. Іх ствараюць паводле прадстаўленага архідыяцэзіяй узору: на медаліку ружанца будзе адлюстраванне Пантыфіка і сцяг Перу. Папа наведае гэтую паўднёваамерыканскую краіну 18–21 студзеня.
†

Акцыя збору
“няўгодных” падарункаў

Яснагорскі дабрачынны пункт заахвоціў палякаў пасля свят сабраць нежаданыя прэзенты. На такую ідэю натхніў ліст чытача ў каталіцкі штотыднёвік “Нядзеля”. “Перыяд свят Божага Нараджэння непарыўна звязаны з уручэннем падарункаў. Многім мы ўсцешымся, але некаторыя адставім у куток. У той жа час для шматлікіх бедных сем’яў гэтыя непатрэбныя нам рэчы з’яўляюцца аб’ектам мар”, – напісаў чытач. Ліст падштурхнуў а. Шымана Ботуля OSPPE, апекуна Яснагорскага дабрачыннага пункта, арганізаваць акцыю, якая мае на мэце збіранне дароў, што будуць размяркоўвацца паміж падапечнымі пляцоўкі. Паводле задумы, з дапамогі змогуць скарыстаць, у першую чаргу, шматдзетныя сем’і, бяздомныя і беспрацоўныя.

Адной з самых
папулярных калядак
200 гадоў!

Песня “Ціхая ноч”, створаная ў 1816 годзе і выкананая праз 2 гады падчас Пастэркі ў невялічкім касцёле ў Оберндорфе каля Зальцбурга (Аўстрыя), простымі словамі і з вялікай чуласцю перадае таямніцу Божага Нараджэння. У 2018

годзе з нагоды 200-годдзя першага выканання калядкі, рыхтуюцца юбілейныя ўрачыстасці.

Між іншым, будзе адкрыты адноўлены музей “Ціхай ночы” ў Оберндорфе і выстава з гэтай нагоды ў Зальцбургу. Аўстрыйская пошта ўшануе 200-годдзе “Ціхай ночы” выпускам спецыяльнай маркі.